БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

…с: Рэдакцыі Ново-Серпухуская 29
Адміністрацыі Захароуская
«Юбілейны Дом».

…акцыя адчынена ад 1 до 2 гадз.
пасьля поудня.
…міністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз.
У вечары ад 5 да 7 гадз.

…акцыя пакідзе за сабой права па…
…уляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Надпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 руб.,

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран 1 руб.
на апошняй—50 к п

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 82. Менск. Пятніца 5 ліпня 1918 г. Год I

Глаунакамандуючы
10 АРМІІ
Аддз. IV a/V № 7508.

Штаб арміі 1 чэрвеня 1918 г.

РАСПАРАДЖЭННЕ

датыча грашавых знакоу у районі 10 арміі.

На аснові артыкулу 43 Гаагскай Конвэнцыі аб вайне …сушы і п. А.І. Імпэратарскага распараджэння ад 22 лістапа… 1916 г. (Сабранне Армейскіх распараджэнняу, стр. 514), …ым наказуецца:

§ 1. Пазычковыя білеты Усходняго Таргова-Прамысловаго …нку, „Пазычковай Кассы Ост" у районі арміі есьць уста…уленныя грошавыя знакі, якія павінны быць прыняты усі… пры плацежах, ні выключаючы публічных касс, па …вердаму курсу аднаго рубля (обэрост рубель) за дзьве …рманскія маркі.

Гэтае прэдпісанне прыменяецца і пры выпауненні кон…актау, адбыушыхся да яго, ні гледзючы на тое, якія гро…авыя знакі былі адзначэны пры заключэнні умовау.

§ 2. Контракты, якія выключаюць плацежы рублямі обэро…а, моцы ні маюць. Ні датыча гэто дапушчаных нямецкіх …нкау і прызнаных Глауным Камандаваннем мейсцовых …нкау і крэдытных установау, якім дазваляецца адчыняць …кучыя рахункі у нямецкіх марках з абавязкам выплаты …гай самай валютаю.

Вымагання і прапанавання болей выгадных умовау …ы іншых грашавых знаках замест обэроста забаронены.

§ 3. Тавары уселякага роду павінны быць с паметкамі …н, толькі маркамі, або рублем обэроста па курсу, адзна…анаму у арт. 1 гэтаго распараджэнння.

§ 4. Грашавым штрафам да 20000 марак і арэштам да ад…аго году, або аднэй з гэтых карау, калі па другіх угалоу…ых законах ні належыць цяжэйшай кары, будзе карацца …й, хто, ні гледзючы на арт. 1, адмовіцца прыняць у зап…ату рублі обэроста, або зробіць адмечаные у артыкулі 2 …абароненыя і ні маючыя моцы здзелкі, ці пабудзіць да іх, …бо нарушыць наказ арт. 3.

Ніжалежна ад кар могуць быць канфіскованы рэчы …раступкау, а глаунае тавары, ніпамечаныя і прапанованыя … згодна з наказам арт. 3. У тым выпадку, калі конфіска…ыя ні выпауніма, дык замест яе можа быць пастаноулена …лаціць за тавары грашмі.

Грашовыя штрафы, арэшты і конфіскацыя робюцца …аеннымі судамі аба ваеннакамандуючымі.

§ 5. Пункт 3 гэтаго распараджэння уступае у сілу ад 1 ліп…я 1918 году; рэшта пунктау зараз-жа.

Штаб арміі. 1 чэрвеня 1918 г.

ГЛАУНАКАМНДУЮЧЫ 10 АРМІЯЙ,
падпісау фон **Фанкельгайн,**
Генэрал ад Інфантэрыі.

Менск 5/VII.

Беларусь і большэвікі.

Жывучы на весцы кожны шукаець рэшткау большэвізму у селян. Трэба прызнацца, што знайсьці іх німажліва, бо яны, як наносны туман зьнесены ветрам.

На дэкрэту Леніна, зараз жэ падзялілі увесь жывы і мертвы інвэнтар большэвіцкія салдаты камісары. Усе запасы былі зглумлены і падзеляны. Цяпер па весках німа чаго есьці. Дзьве трэці людзей есьць розныя балтушкі з шчау'я і травы. На падзенную работу ні ідуць, бо ні хватаець сілы акуратна працаваць. Падвозу хлебу німа. Цяпер усю віну за голад і зністожэнне запасау ускладаюць на большэвікоу. Злоба на іх расьцець. Традыцыйнае жыцце мірнаго часу есьць ідэал беларусау: «толькі трэба, каб далі зямлі законам, па парадку, а ні грабежствам, і каб чыноунікі і паны ізноу ні заціснулі народ». Вось палітычная і нацыяльная пляцформа, аглушэнных і разачарованных абецанкамі «рая на зямлі». Здаровы гаспадарскі розум беларускаго земляроба так сама консэрватыуны, як консэрватыуна зямля, што яго корміць.

Некаторыя людзі думаюць, што агульнае выборнае право апасна даваць народу. Павыбіраюць ізноу безадпаведных дэмагогау.

На гэта німа чаго спадзевацца. Народ пойдзе толькі за праудзівай інтэлігэнцыяй. Рэвалюцыей 1905-6 году рукавадзілі студэнты і ідэйная інтэлігэнцыя. Наступіла рэакцыя, а адношэнне народу да дзеячоу рэвалюцыі было самае сьвятое і паважаемае. Іх нігдзе ні праклінали так і ні мелі да іх ненавісьці, як цяпер большэвікоу, каторымі называюць усіх агентоу цяперашняй рэволюцыі.

Быу адзін сьмешны выпадак, характэрызуючы нагляд на «рэвалюцыю». Адзін майстэр быу на рабоце у двары, гаспадар, каб паддабрыцца майстру, назвау яго «таварышам». Майстэр палічыу гэта за ганьбу і крыуду і два дні ні хадзіу на работу, пакуль яго ні перэпрасілі. Sic tranzit gloria mundi!

Агульныя весткі.

ШТОКГОЛЬМ, 1/VII. Як паведамляе дэпэша у «Афтонбладтэ», болей 100,000 скандынаўцаў, па большай часьці з заходных вобласьцей цэнтральных штатаў, запісаліся на ваенную службу у армію і болей 30,000 чалавек у флот Злучаных Штатаў. Газэта замечае па гэтаму поваду, што з добравольнай запісью штосьці ні ладно. З швэдска-амэрыканскіх газэт відаць што многія са скандынаўцаў за ніпаслуханне былі прыгавораны да шмат гадоў турмы.

БЭРН, 1/VI. Ваенным судом у Спарце прыгавораны 2 дэпутаты, быўшы пракурор і палкоўнік, разам з 9 едзінадумцамі да 8 гадоў прымусовых работ, за тое, што яны перад назначэннем ураду Венізэлоса пробавалі апавешчаць аўтаномію Пелопонеса.

БУКАРЭШТ, 2/VI. Румынскія ветэраны вайны 1877—78 г.г. выпажылі у прэдстаўленым парляманту мэмарандуме сваё бязмежна скрутнае становішчо і патрэбавалі, каб ім была зроблена матэрыяльная падмога са здабыткаў быўшых прэмьер - міністраў, дзеля таго што толькі апошнія і вінаваты у ніпчасьці краю.

КОПЭНГАГА, 1 гм. У Рэйкіявіку пачаліся перагаворы аб стасунках Ісландзіі да Англіі. «Berl. Tid.» кажа, што у гэтым ёсьць уплыў Англіі. Ісландзія хоча прызнання яе нізалежнай державай.

ЛЕНДАН, 1 гм. «Reuter». Пасол Біллінг, каторы у Ніжняй Палаці проці перасьцярогі спікера хацеў гаварыць аб справе інтэрніравання падданых непрыяцельскіх дзержаваў быў па пропазыцыі Бонар-Лоу выключаны на ніабмежаваны час і гвалтоўна выведзены з салі.

Весткі з Расіі.

МАСКВА, 1/VII. Прэдстаўнікі дзержаў Згоды адказалі на расійскую ноту пратэста проціў высадкі войск на Мурманскім беразі, што належачы дзержавам Згоды вартны ваенны матэр'ял, каторы ішчэ знаходзіцца у Архангельску, павінен ахраняцца. Французкі пасол Нуланс прыбыў з Вологды у Маскву, каб весьці перэгаворы з расійскім урадам па пытанню аб заняцці Архангельску.

ГААГА, 1/VII. Народны камісар па міжнародных справах заявіў прэдстаўнікам друку, што урад згадзіўся на зварот Чорнаморскаго флоту у Севастополь пад умовай, што Германія і яе хаўрусьнікі у працяг вайны ні будуць карыстацца караблямі і пасьля заключэння міру зараз жа перэдадуць іх назад Расіі.

— ЦУРЫХ 2 гм. «Нов. Цурыхск. Газ.» паведамляе, што у Расіі на весках распушчаны іслнаваушыя да гэтаго селянскія «саветы» і на іх мейсцо сформаваны новыя з беззямельных селян.

Тая-ж газэта паведамляе аб новым дэкрэце большэвіцкаго ураду, які пад страхам кары страхам сьмерці забараняе вясьці гандэль цэннымі паперамі.

З «Berner Bund» - у даведываемся аб смутным льосе Крыленкі і Дыбенкі—«Главковерха» і «Главкофлота»: Дыбенко сядзіць без работы. Крыленко уволены ад пракурорства у Маскоускім рэв. трыбунале шукае пры помачы абвестак у газэтах сабе заняцця.

З Украіны.

КІЕУ, 3/VI. 27-го чэрвеня гэтман прыняў дэлегацыю зьезду украінскіх земств, перэдаўшую яму мэморандум, у каторым сказано, што палітыка цяперашняго габінэту выклікае безпакойнасьць і ніуздаволянасьць у краю і што дзеля гэтаго конча патрэбно стварыць новы нацыянальны габінэт, каторы павінен зараз жа склікаць установчы Сойм і дзержаўную раду. У украінскіх урадных кругах кажуць аб хуткай перамені габінэту.

КІЕУ. Зноў назначаны на пост украінскаго пасла барон Стэйнгэйль адбыў 29 чэрвеня разам са сваім пэрсаналам у Бэрлін.

Інтрыгі вялікарускіх шовіністау.

У «Czas» пішуць с Кіеву: «На усеукраінскім зьездзе бацькоў у Кіеві пастаноўлено: «у урадовых школах абавязкова навука рэлігіі для праваслаўных дзяцей. У урадовай школе павінна захавацца расійская мова, як мова навуковая, каторая абавязкова для усіх народаў застаючыхся у зьвязку з расійскай культурай.(!)

Можна завесьці факультатыўнае навучэнне украінскай мовы, па жаданню бацькоў. Расійская гісторыя павінна быць абавязковай, бо толькі праз яе можна зразумець гісторыю Украіны. У каждым выпадку аб навуковай мове могуць пастаноўляць толькі бацькі».

Адначасно пішуць у «Нов. Цурыхск. Газ.»: «Украінская мова, у Расіі ёсьць так зв.

мёртвай моваю. Нават у Кіеві Украінцы ні ўладаюць добра сваёй моваю. Перад вайной толькі нівялічкая група думала аб Украіне; клічам народу было: «мы Малорусы, брацця Вялікарусаў, але ні Украінцы». Цяпер чуецца заклік: «Украінцы учыцеся па украінску» і вось выдаюцца граматычныя падручнікі, з каторых кожны так моцна рожніцца ад другіх, што ні можна у іх знайсьціся».

Весткі с Польшчы.

— З Варшавы паведамляюць ад 1 гм., што польскае міністэрство фінансаў запыталося у зьвязку варшаўскіх банкаў, ці могуць банкі зрабіць пазычку польскаму ураду, высокасьцю да 20 мільён. Зьвязак абецаўся зрабіць такую пазычку, каторая будзе унесена у бюджэт будучаго году. Сума гэта патрэбна на выдаткі па звароту уцекачоу і апецэ над убогімі.

Подлуг унесенаго у Раду Стану праэкту адміністрацыйнаго устройства К. Польскаго, даўнейшы падзел панства на губэрні касуецца; замест—іх ўводзяцца «ваяводствы», падзеленыя на паветы, а паветы на валасьці [гміны]. Варшава прыраўноўваецца да ваяводства, горады у 250 і 40 тыс. жыхароў, будуць асобнымі адм. адзінкамі у ваяводств. і паветах. На мейсцо губернатароў каралём будуць пазначацца «ваяводы», каторым пад'уладны будуць усе чыноўнікі, апрача судовых, скарбовых і вайсковых; «ваявода»—начальнік паліцыі, выконаўца усіх міністэрскіх распараджэнняў і прэзэс земскаго сэйміку і ваяводскаго ураду. Да яго каралём назначаюцца 8 райцаў па рожным справам ваяводства, на кшталт асобных міністраў пры боку ваяводы.

Сэймік ваяводства складаецца с прэдстаўнікаў меськіх і гмінных радаў выбраных на 6 гадовы срок, па 1 ад 10 тыс. жыхароў. Ен ведае гаспадарчымі справамі ваяводства. Яго выконаўчы орган ваяводскі урад» з 8 выбраных членаў.

На чале паветаў стаяціме «староста» назначаны каралём і пад'уладны «ваяводзе. Арганізацыя паветаў і функцыі «старасты» больш-менш падобны да тых-жа у «ваяводствах», але у меньшым масштабі.

Міністр ўнутраных справаў можа выдаваць паліцыйныя распараджэнні пад прыгрозаю кары у 2 тыс. марак альбо 1 месяцу арэшту, ваявода пад прыгрозаю кары у 1000 марак, альбо 2 тыдняў арэшту, стараста—да 500 марак альбо 1 тыдня арэшту.

На пастанауления востай ці бурмістра можна будзе скардзіцца старосьце, па старосту —ваяводзе, на ваяводу—міністру.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Да прыезду р.-к. епіскапа. Прыезд у Менск зноу назначанаго р.-к епіскапа Лозінскаго, маючы быць 7-го ліпня, адбудзецца некалькімі днямі пазднеи.

Аванс. Менскай управай прэдостаулен нямецкім градоначальством аванс у 100,000 мар. З гэтай суммы 5,000 марак выпісано у расход за пастой нямецкіх салдат у гасьцінніцы «Эуропа» В. Поляка.

Харчы. Беларуская гандлевая палата у Кіеві, на чале каторай знаходзіцца вядомы прафэсар Доунар-Запольскі, старанна працуе над пытаннем аб установленні тавараабмену паміж Беларусью, якая адчувае востра нідахват у прадуктах першай патрэбнасьці, і Украінай.

Апошняя пазнаеміушыся са становішчам спрау у вобласьці харчоу у тутэйшым краю, прызнала мажлівым вайсьці у канкрэтныя умоуныя адносіны с Беларусью аб тавараабмену зараз жа. Па умове, праэкт якога украінскім урадам гэтымі днямі будзе санкцыяніраваны, суммарная цыфра тавараабмену —30 мільенау рублеу. Украіна цяпер жа у гэты рахунак авансіруець патрэбных для Беларусі прадуктау, як цукер, крупы, мука, селядцы і інш., выключаючы хлеб, на 3 мільены руб. у формі абмену за лес, дастауляемы адгэтуль.

Хлебнае пытанне мінуе сваю вострую стадзію ні раней новаго ураджаю.

Цяпер хлебнае становішчо, як паведамляюць з мейсц, і па весках стаіць ні лепей. Там есьць такія-сякія з апасы у найболей гаспадарных вясковых «кулакоу».

Характэрна розніца паміж цэнам на хлеб у вольнай прадажы у Менску (2 р. 80к.—3р. фунт) і мястэчковымі: У Койданове —1 р. 30 к. фунт, у Сенніцы— 1 р. 40 к., у Рубежэвічах—1 р. 50 кап.

Цукер у вольнай прадажы усюды у менскім районе расцэніваецца 7—7½ руб. фунт. Жоуты (постны) цукер у 1 м пазычкова - зьберэгацельным т-ве адпускаюць па 5½ руб. ф. і масло кароуе ідзець па 12—13 руб. фунг, з вулічных пад'ездау і будак (вельмі сумніцельнаго гатунку)—5 руб.

М. Д. Агрэнева-Славянская, прагасьціушая у нас у Менску амаль увесь час вайны, гэтымі днямі едзе на Украіну.

Да праверкі бонавых кніжак у 5-ці бюро можам павядоміць, што ні водная з групп дзержацеляу кніжак, намечаных у быушыя дні, сваечасна, ні усьпеваюць!

Апавешчано, што усе апаздаушыя павінны яуляцца 12-го ліпня.

У бежанскіх камітэтах, глаунае у польскім, апошнімі днямі прымечаецца сільны націск. Бяруць пропускі у Царство Польскае і Літву.

Зьменьшэнне штатау меськай управы дайшло і да аддзелу сэкрэтарыяту, дзе маюць быць уволены 4 агенты.

Табак, махорка і папіросы, па загаду нямецкіх уласьцей забаронено вывазіць з места.

Курс царскаго рубля зноу паніжаны. «Вэксэльштубе» пры абмене царскіх на акупацыйныя, пачала даваць за 1 руб.— 1 марку.

Весткі с краю.

(Ад уласнаго кор-та.)

Сяло Каралішчавічы Ігумен. п.

Дзякуючы стараннням і добрае хэнці нашае сельскае вучыцелькі п. Александры Міцкевіч, у сяле нашым, 30 чэрвеня, адбылося тэатральнае прэдстаўленне на каторым было вельмі людна і весяла. Усім нашым селянам і з другіх сёл гасьцям, вельмі падабалося, бо кожны з іх чуў і бачыў сваё нацыянальнае. Гралі «Міхалку», «Паўлінку», пелі Беларускія песьні і дэкламавалі.

З артыстаў больш усіх выдзеляўся п. Плашчынскі. Пры учасьці сына месцоваго дзедзіча нашаго двара п. Людвіка Прушынскаго была і лётарэя. Уход да тэатру усім быў даступны як пажылым асобам, так і дзецям, бо плата была ні вялікая: узрослыя плаціլі па 50 кап., а дзеці па 30 кап. Збор грошэй быў вялікі, бо адных толькі лётарэйных білетаў было прадано 250 ш. па 50 кап. за білет; уся сумма паступіла на дабрачынныя рэчы.

Цэнючы працу нашае вучыцелькі п. А. Міцкевіч, якую яна палажыла у гэтае справе на карысьць нам і нашым дзецям, шчыра ей дзякую ад сваіх аднасельчан, а так сама і другім асобам, каторыя прынімалі у гэтым учасьце. Дай Божэ ім ахвоты і надалей працаваць на карысьць людзям.

Станіслау Татаржыцкі.

С. Каралішчэвічы
2 ліпня 1918 р.

Бібліографія.

Алесь Гарун. **МАТЧЫН ДАР.** Думы і песьні. 1907-1914 г. г. Выдана коштам Народнаго Сэкрэтарыяту Беларусі Менск; друкарня Я. Грынблата. 1918. Цана 2 рб.

Першая з выданых Нар. Сэкрэтарыятам літэратурных кніжак умешчае у сабе вершы нашаго песьняра А. Гаруна, напісаныя ім, як гаворыцца у прадмове выдавецкай камісіі, у няволі,—у пэрыодзе 1907-1914 г. г. У начатку ліпня 1914 г. зборнік «Матчын дар» быу перасланы з Сыбіры для друку у Вільню, дзе яго выдаць хацело «Беларускае Выдавецкае Таварыство», але паустаўшая тагды вайна унемажлівіла гэты замер і кніга магла выйсьці толькі цяпер, праз 4 гады. Значная часьць вершау умешчаных у кнізе (25) друкавалася у сваім часе у «Нашай Ніве» часьць (5) у «Вольнай Беларусі» а нікаторая часьць, як мы чулі, была надрукавана ужо у часе вайны у віленскім «Гомане». З ранніх вершау, якія друкаваліся у «Н. Н.», нікаторыя пераправлены аутарам і—трэба прызнаць—выйгралі ад гэтаго

Спосаб выдання можа станавіць хлюбу выдавецкай камісіі Н. Сэкрэтарыяту. Графны фармат, добрая папера, ясны, чытэльны, друк, пекная вокладка работы Р. Земкевіча—усе спрауляе прысмнае уражэнне. Друкарскае выкананне паказуе што у Менску, пекна выдаушым некалі В. Марцінкевіча, можна выдаваць і цяпер пекныя кнігі. На жаль з гэтаго боку яшчэ можна зрабіць адзін закід—за друкаванне без кароткаго у і знака ё (ё), што значна абцяжае чытанне паэзыі, але гэто ні залежыць ад друкарэнь, бо дастаць памяненыя знакі пры цяперашніх варунках амаль што вімагчымо. Звычайны для беларускіх кніжак нідастатак — абмылкі у друку—тутака зьведзены да найменьшаго, хаця апрача паказаных у аншлагу, у тэксце спатыкаюцца яшчэ 2—3. Пры усіх паказаных добрых азнаках выдання, цана кнігі вершау, у 128 стран, усяго 2 рублі, павінна быць прызнана нізкай і даступнай.

N.

Францішк Олехновіч.
БАЗЫЛІШК.

Казка у 3 актах. Вільня. Выд. А. Луцкевіча. Друк. М. Кухты, 1918 г. цана 50 фэн.

Перад намі нівялікая кніжачка—адбітка з Гомана. У ей Ф. Олехновіч у пекных тонах ўваскрашае старую, падслуханую ім у мурах старога беларускаго княжаго места, легенду:

У даўнія—даўнія часы, так што аж імёны гэрояў сьцёрліся у памяці люцкой, над княжым местом страслося вялікае нішчасьце. Страшны зьмей —Базылішк падступіў пад меськія муры і ні дасьць ні праходу ні праезду ані ў место, ані з яго. Страшным бляскам свайго чараўнічаго пагляду, ён застаўляе людзей падаць абамлелымі на зямлю і высмоктвае з іх кроў. Ні аднаго сьмельчака, з тых што па закліку княжаму выходзілі на бітву з ім, Базылішк умярцьвіў. Загінулі усе. Больш ахвотні на барацьбу с почварой ні Мешчане замучаныя стра ні ведаюць што рабіць. место адрэзанае ад усяго сь ту аблогай Базылішка нас ваецца беда. Знайходзіцца н кі стары чалавек які пуш думку, што зьмею патрэ ахвяра—дачка князя—і та ён адступіцца. Мешчане га вы прынесьці такую ахвяр ужо ідуць да князя з зап рабаваннем аддаць на сьме князёўну. Князь, шкадую маладосьці сваёй доні, х сам падняць у свае ста рукі меч, калі німа у сьмельцоў ні сярод баяр, сярод воінаў, ні сярод пас літаго люду. Князёўна, а рэная тхорлівасьцю мужч кінуўшы ім словы пагар ідзе сама на сустрэч св згубе, ідзець да Базылiш Але на парозе з'яўляецца п ланец князя, з тых што п калі ахвотнікаў: ёсьць, ёс ішчэ адзін сьмелы чалавек. Хто гэто? Вочы усіх зьвер юцца да дзьвярэй з за як ўвыходзіць... дурны Янка. гэты ні да чаго, апрача пе няў, ні здатны, катораго у «душа сумуе» ні ведама с го, ён пойдзе.

Душа Янкава сумуе па дасягнёным шчасьці—кахан князёўны. Песьні яго—пес закаханага сэрца, каторае п рушае яго на вялікі чын. Я ка ідзе і люстэркам звар вае сілу, якая хаваецца у в чах зьмея проці яго само Зьмей падае ні вытрымаўш свайго-ж пагляду. Рагаці канчае яго жыццё. Пабед грыміць рог узяты Янкам князя. Пазбаўлены страху н род выслаўляе гэроя, а ста князь ў нагараду аддаець я сваю дачку, сэрцо якой запал лося каханнем да яе збавіцеля.

Напісаная для сцэны, каз нават у чытанні робіць арт стычнае ўражэнне. Аутор до ра вытрымаў патрэбны д рэчы наіўны топ сярэдняв ковых сцэнічных выставаў.

В.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоўна камандавання за 3 ліпня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.

Усьпешныя баі разведчыкаў. Сільныя націскі ангель у Мэррыс і Муайенвіль (паўднёвей Арраса) пацярпелі дачу. У часе мейсцовых бітв паўночна-захадней Альба мы ўзялі палонпых.

Група арміяу Гэрманскаго Кронпрынца.

Паўночней р. Эн сягоння з рання развіліся мейсцо баі. Паміж рэкамі Эн і Марнай прадаўжалася напруджаная варожая дзеяльнасьць. Атакі каля Сэнт-Пьер-Эгль і хадней Шато-Тьерры былі адбіты.

З амэрыканскай эскадрыліі у паветры сілаю у 9 евых адзінкаў, зьбіта 4 самалёты. Лейтэнант Удэт меў с 39, лейтэнант Левенгардт сваі 33 і 34 перамогі у павет Лейтэнант Фрыдрых і віцэфэльдфэбэль Том зьбілі сваіх 20 праціўнікаў.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

Рэдактар **А. Прушынскі.**
Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грынблата.